№ 48 (152) 27 ЛІСТАПАДА 2024 г.
наша СЛОВА.pdf

# Сустрэча з пісьменнікам у роднай школе

21 лістапада ў бібліятэцы лідскай школы № 11 адбылася сустрэча з выпускніком гэтай школы пісьменнікам Леанідам Лаўрэшам.

Пісьменнік заўсёды з вялікай ахвотай наведвае сваю родную школу, якую ён закончыў у далёкім ужо







1980 годзе. На гэты раз пісьменнік прэзентаваў старшакласнікам сваю новую кнігу, прысвечаную важнаму раздзелу гісторыі - некрапалістыцы (Лаўрэш, Л. Л. Лаўрэш, Г. І. **Там, дзе спыніўся час… . Лідскія гістарычныя некропалі.** 2024.). Кніга з'яўляецца вынікам шматгадовай працы, якая ўключала ў сябе збор інфармацыі, валанцёрскую працу на працягу 4-х гадоў па рэнавацыі старых лідскіх могілак, працу ў архівах і збор вуснай гісторыі ў старых лідзян.

У кнізе расказваецца пра ўсе гістарычныя лідскія некропалі, падаюцца геаграфічныя каардынаты тых некропаляў, якія зніклі больш за 200 гадоў таму, вядзецца аповед пра вядомыя і невядомыя асобы, пахаваныя на розных гістарычных лідскіх могілках, даводзіцца вялікая каштоўнасць і неабходнасць захавання некраполяў для нашай гісторыі і культуры. Пра ўсе гэта і распавёў вучням сваёй былой школы пісьменнік, які шмат ужо гадоў спецыялізуецца на тэме нашай гісторыі.

Мерапрыемства правяла бібліятэкарка школы, вялікі эрудыт і знаўца лідскіх старажытнасцяў, Тамара Зенюкевіч. На сустрэчы прысутнічалі школьнікі - будучыя чыгуначнікі (на здымках яны ў сініх кашульках), цікава, што і сам лідскі пісьменнік з'яўляецца сынам машыніста цеплавоза і неаднаразова пісаў пра гісторыю лідскай чыгункі.

*Яраслаў Грынкевіч.*